CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

| KOD | PESEL |
| --- | --- |
| | |

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

**Egzamin maturalny** *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

**TEST DIAGNOSTYCZNY**

*Symbol arkusza*
MMBB-P0-100-2412

DATA: **6 grudnia 2024 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia zdającego do:

☐ dostosowania zasad oceniania.

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

## Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 18 stron (zadania 1–12). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
4. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
5. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
6. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w tabelkach przeznaczonych dla egzaminatora. Tabelki są umieszczone na marginesie przy każdym zadaniu.
8. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
9. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
10. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2024/2025**

**Poziom podstawowy**
Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблii*;
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*;
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы; Мужыцкая праўда № 1*;
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*;
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай; Калыханка, выбраныя вершы*;
Змітрок Бядуля, *На каляды к сыну; Пяць лыжак заціркі*;
Цётка, *Шануйце роднае слова*;
Максім Багдановіч, *Апокрыф; Хто мы такія; Санет*, выбраныя вершы;
Максім Гарэцкі, *Рускі; Стары прафесар*;
Янка Купала, *Курган; Незалежнасць, Явар і каліна, Спадчына*, выбраныя вершы;
Якуб Колас, *Новая зямля, Што яны страцілі*;
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*;
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы;
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская*, выбраныя вершы;
Янка Брыль, *Галя, Маці*;
Ян Скрыган, *Слепата*;
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*;
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*);
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі, Дарога праз лес*;
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*); *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы;
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*;
Сакрат Яновіч, *Гасцінец, Прыгожай, Бацькаў гнеў, Вёха – багіня ганьбы*;
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві*..., выбраныя вершы;
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай);
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*;
Алесь Барскі, *Беластоцкі край; Я сын зямлі беластоцкай..., Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы;
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*);
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1 раздзела часткі другой).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч*, За сто лет;*
Максім Гарэцкі*, Фантазія;*
Якуб Колас*, У палескай глушы (*фрагмент *XVI часткі);*
Янка Купала*, Тутэйшыя;*
Рыгор Барадулін*, Жыццё і паэзія;*
Сакрат Яновіч*, Пад знакам Арла й Пагоні (*фрагмент *30. Эліты);*
Ларыса Геніюш*, Споведзь;*
Надзея Артымовіч*, Ёсць тое...,* выбраныя вершы;
Алесь Разанаў*, Sumus ne simus,* выбраныя вершы;
Вольга Рымша*, Рэквіем;*
Уладзімір Арлоў*, Незалежнасць – гэта...;*
Барыс Пятровіч*, Трызненні (*фрагмент *Шчасце быць – 1).*

## Część 1. Test językowy

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

Паводле Марыі Гіліцы
***Што нам рабіць: засвойваць замежныя словы ці называць рэчы на сваёй мове?***

Чытала артыкул, радкі беглі хутка, цікавая і прыемная інфармацыя, а потым сустракаю выраз „пэт-тэрапія" і адчуваю здзіўленне ды пэўны дысананс. Адчула, што шчыра дзівішся, калі ў медыйных тэкстах бачыш запазычанае слова, фразу, тэрмін ці выраз, якія ты не сустракаў раней. [...]

Калі слова новае, часам яно нават пужае. Бо калі прыглядаешся, то бачыш, што з'ява ці прадмет, за ім схаваная, – добра вядомая, абсалютна родная. І калі яна падаецца ў „абгортцы" чужых спалучэнняў літар і гукаў, гэта выклікае дысананс. Пэт-тэрапія. Гучыць насцярожліва, халодна. Тэрапія жывёламі – гучыць прыемна, мякка (бо на знаёмыя словы з'яўляюцца асацыяцыі: пухнатыя сабакі, каты, прыемна з імі бавіцца і г. д.). Лячэнне жывёламі […] – гучыць зусім зразумела.

Вядома, выкарыстанне замежных гатовых выразаў эканамічнае, ашчаджальнае. Менавіта гэтая замежная мова, дакладней яе носьбіты, „прыдумалі абазначаць" пэўную з'яву, аб'ект, яны вылучылі яе з рэчаіснасці і назвалі, бо мелі ў гэтым патрэбу. А іншыя народы запазычваюць і з'яву (як, напрыклад, віды лячэння), і часта тэрмін, бо ён лаканічны. Але, магчыма, калі мы пакуль не прыдумалі свой добры адпаведнік, больш варта ўсё ж выкарыстоўваць доўгія апісальныя выразы, калі гэта дазваляе мова. І гаворка менавіта пра публіцыстычныя тэксты, якія чытае шырокае кола людзей. […]

Выраз „тэрапія жывёламі" ці „лекаванне жывёламі" ў вялікай колькасці людзей, хіба ў большасці, адразу нараджае патрэбныя асацыяцыі: чалавек ведае ўсе словы, ведае сам выраз альбо можа яго зразумець. […] Выраз „пэт-тэрапія" патрабуе спачатку перакладу „пэт" на сваю мову, а потым ужо нараджаюцца патрэбныя вобразы. […]

Можа, варта не злоўжываць замежнымі […] словамі […], а варта прыўносіць новыя з'явы і аб'екты ў сваю мову сродкамі сваёй мовы. Калі мы прыўласніваем з'явы і аб'екты, навошта цурацца рабіць гэта сваёй мовай? […]

Такіх прыкладаў, як пэт-тэрапія, можна прывесці шмат. Кол, лайфстайл, […] перформанс, тынэйджар […]. Многія з такіх слоў будуць нават не новымі: гэта звычайныя беларускія словы, якія шырока ўжываюцца і якія чамусьці замянілі на калькі (лайфстайл – лад жыцця, тынэйджар – падлетак, джоб-офер – прапанова працы).

Гэты артыкул ніяк не заклікае пазбягаць любога калькавання замежных слоў. Мы да ўсяго можам бачыць, як і развітыя еўрапейскія мовы запазычваюць у свой лексікон многія іншамоўныя словы […]. Але гэты артыкул – спроба звярнуць увагу на гэтае важнае моўнае пытанне.

https://budzma.by

**Заданне 1. (0–2)**

**Ацані правільнасць сцверджанняў, змешчаных у табліцы, у дачыненні да стылістыкі тэксту Марыі Гіліцы. Пазнач ТАК, калі сцверджанне правільнае, або НЕ – калі няправільнае.**

1\. 0–1–2

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Тэкст мае суб'ектыўны характар. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Тэкст уяўляе сабой навуковую апрацоўку праблемы. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Мэта тэксту – пераканаць чытача. | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 2. (0–1)**

**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы для слова *асацыяцыя* падае тры значэнні. З якім з іх суадносіцца гэтае слова ў другім абзацы прыведзенага тэксту? Пазнач правільны адказ сярод А–В.**

2\. 0–1

**А.** Аб'яднанне асоб або арганізацый аднаго роду дзейнасці. *Асацыяцыя навуковых супрацоўнікаў. Краязнаўчая асацыяцыя.*
**Б.** Група, спалучэнне, злучэнне чаго-небудзь. *Асацыяцыя малекул. Зорная асацыяцыя.*
**В.** Сувязь паміж асобнымі ўяўленнямі, думкамі, пачуццямі, пры якой адно выклікае другое. *Асацыяцыя па падабенстве.*

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, https://skarnik.by

**Заданне 3. (0–2)**

**Падбяры і запішы антонімы да прыведзеных ніжэй слоў.**

3\. 0–1–2

запазычаны – …………………………………………………………………………………………

лаканічны – …………………………………………………………………………………………

ганарыцца – …………………………………………………………………………………………

**Заданне 4. (0–1)**

**Растлумач сваімі словамі, чаму слова *абгортка*[1] ў прыведзеным ніжэй сказе з тэксту ўзята ў двукоссе.**

4\. 0–1

І калі яна падаецца ў „абгортцы" чужых спалучэнняў літар і гукаў, гэта выклікае дысананс.

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

[1] Абгортка – паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, тое, чым абгорнута што-небудзь. *Цэлафанавая абгортка*.

5.
0–1

**Заданне 5. (0–1)**

**Ці дае тэкст адназначны адказ на пытанне, якое служыць яму загалоўкам? Падай адзін аргумент на карысць сваёй думкі.**

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

6.
0–1–2–3

**Заданне 6. (0–3)**

**Напішы рэзюмэ да тэксту аб’ёмам 40–60 слоў.**

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

.........................................................................................................

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

Wykonaj zadania. Odpowiadaj tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

### Заданне 7. (0–2)

Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент апавядання *Галя* Янкі Брыля.

Спакойны жнівеньскі вечар. Сонца зайшло. Галін хлопец, падлетак Антось, пайшоў у поле да малатарні. На верхавіне старой ліпы за агародам пагасла чырвань на лісці; шпакі ўзняліся з голля і панеслі свой кірмаш у вёску. Пад паветкай за сенцамі, аддаўшы вячэрні ўдой, лягла на свежым подсціле карова. У хаце за сталом сядзіць чарнявая Сонечка, на поўны рот запіваючы хлеб сырадоем. Тонкія загарэлыя ножкі яе, як і ва ўсіх пастушкоў, папораны ржышчам. Сонечка памыла іх каля студні халоднай вадой, і ногі садзеюць да самых каленак. Яна то пацірае іх адна аб адну, то проста стрыжэ імі пад высокай лавай. Сонечка хоча гаварыць.

– Мамка, – кажа яна, – а сёння Лёня Сцяпанаў смяяўся з мяне. Ты, кажа, пані. Ты, кажа, хутаранка. А чаму? Чаму ён смяецца?

Галя стаіць, прыпёршыся да шафкі з посудам, амаль прысеўшы на яе. Над галавою Галі, на сцяне – стары гадзіннік. На запыленым цыферблаце яго напісана не нашымі літарамі нейкае слова. За ўсе гады, пакуль гадзіннік тут вісіць, ніхто нават не пацікавіўся, што яно азначае. Наогул па гадзінніку разбіраліся толькі мужчыны і Галя. Свякруха пражыла свае семдзесят год, ні разу не падумаўшы аб тым, якое сёння чысло...

https://knihi.com

7. 0–1–2

**На падставе прыведзенага фрагмента і цэлага тэксту прывядзі дзве рысы рэалізму, якія прысутнічаюць у апавяданні.**

1) ..........................................................................................................

..........................................................................................................

2) ..........................................................................................................

..........................................................................................................

**Заданне 8. (0–1)**
Прачытай пададзены ніжэй верш Янкі Купалы.

Янка Купала
***Спадчына***

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пастбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладзьбішчы.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

https://knihi.com

8.
0–1

**Працягні наступны сказ, выбіраючы сярод варыянтаў А–Г.**

Тэмай верша *Спадчына* Янкі Купалы з'яўляецца

**А.** Біяграфічныя матывы.
**Б.** Малая радзіма.
**В.** Патрэба шанавання Радзімы.
**Г.** Пейзаж.

**Заданне 9. (0–1)**

Прачытай пададзены ніжэй урывак з твора.

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...

2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі пракокі. [...]

4. І разам з ім святы Пётра і святы Юр'я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго. […]

7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падышоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.

8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае і не хавай аблічча ад вачэй людскіх. […]

13. Так навучаў Хрыстос музыку. Але Пётра, пачуўшы словы яго, сказаў: Вучыцелю, у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?

14. У адпаведнасці яму сказаў Хрыстос: так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?

https://knihi.com

**Запішы аўтара і загаловак твора, фрагмент якога прыведзены.**

Аўтар:.......................................................................................................

Загаловак:..................................................................................................

| 9. |
| --- |
| 0–1 |
| |

**Заданне 10.**

Прачытай пададзены ніжэй фрагмент апавядання Змітрака Бядулі *Пяць лыжак заціркі*.

І шчаслівая сямейка хваталася за лыжкі.

– Ай! Ай! – запішчэлі дзеткі.

Антось вылупіў вочы і моўчкі давіўся гарачай заціркай.

– А каб вас ліханька не ўзяло. Я ж вам казала – не хапайце, бо гарачая! – лаяла іх Агата.

Пазіралі, пазіралі яны на гарачую заціркy і не вытрывалі – зноў давай есці... Ажно слёзы каціліся з вачэй. Не з'елі яшчэ і трэцяй часткі, як у хату ўвайшла суседка Сцёпчыха.

– Дзень добры!

– Дзень добры!

– Хлеб ды соль!

– Дзе тут хлеб – заціркy ядзім, просім на снеданне! – кажа Агата.

– Ого! На заціркy і я ахвотніца! – адказала Сцёпчыха, і яе галодныя вочы заблішчэлі. Узяла лыжку і спрытна падсела да міскі...

Спахмурнеў Антось і толькі ніжэй апусціў галаву.

– Нам і самім мала, – падумаў ён.

З’ела Сцёпчыха адну лыжку і ўзялася за другую.

– О, каб цябе! – хацеў сказаць Антось і ледзь стрымаўся. Дзеткі таксама пачулі небяспеку і, скоса пазіраючы на Сцёпчыху, спрытна запрацавалі лыжкамі...

– Тры! – чуць не крыкнуў Антось, як Сцёпчыха зачэрпнула лыжкай у трэці раз.

– Ратуйце! Ратуйце! – ледзь не плакаў ён, як яна апусціла лыжку ў міску ў чацвёрты раз. А як з’ела пятую, то ўжо міска была пустая...

https://knihi.com

10.1.
0–1–2

**Заданне 10.1. (0–2)**

**На падставе фрагмента і цэлага тэксту ацані праўдзівасць наступных сцверджанняў. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Пяць лыжак заціркі ў аднайменным апавяданні сімвалізуюць шчасце галоднага чалавека. | **П** | **Н** |
| **2.** | Пяць лыжак заціркі сімвалізуюць гасціннасць беларускага сялянства. | **П** | **Н** |
| **3.** | Сцёпчыха ў дадзеным апавяданні з’яўляецца сімвалам сквапнасці. | **П** | **Н** |

10.2.
0–1–2

**Заданне 10.2. (0–2)**

**Якой праблеме беларусаў, якая мела месца ў гісторыі, прысвечаны твор Змітрака Бядулі *Пяць лыжак заціркі*? Свой адказ абгрунтуй, прыводзячы адзін аргумент.**

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

11.
0–1–2

**Заданне 11. (0–2)**

**Да твораў 1–3 падбяры адпаведны матыў А–Г. Упішы адпаведную літару ў табліцу.**

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | Максім Гарэцкі, *Рускі* | |
| **2.** | Ян Скрыган, *Слепата* | |
| **3.** | Аляксей Дудараў, *Вечар* | |

**А.** прыгажосць
**Б.** вар’яцтва
**В.** здрада
**Г.** адзінота

## Część 3. Wypracowanie

**Заданне 12. (0–30)**

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **адзін твор са спісу літаратуры** і на **іншы выбраны твор беларускай літаратуры** (тэма 2).
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1.
**Што значыць быць добрым чалавекам? Паразважай над пытаннем на падставе верша Францішка Багушэвіча *Калыханка* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Францішак Багушэвіч
***Калыханка***

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі;
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці...
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачынкай...
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А ўсякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...

Бо ўжо курачкі паснулі.
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тагды матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ёй аб сыне,
Каб не ведаць, гдзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі.
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі...

https://knihi.com

Тэма 2.
**Ці багацце гарантуе шчаслівае жыццё? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на адзін твор са спісу літаратуры і іншы выбраны твор беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** ☐

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **0** | **1** | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* Brak lektury obowiązkowej. | Nie dotyczy problemu. | Nie jest wypowiedzią argumentacyjną. |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | | | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | **0** | **1** | **2** | **3** |
| | | G F | E C | D B | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | *Liczba błędów w spójności* | **0** | **1** | **2** | **3** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | **0** | **1** |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | *Liczba błędów językowych* | **0** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| | | | 1G 2F 3E 2G 3F 3G | 1F 2E 3D | 1E 2D 3C | 1D 2C 3B | 1C 2B 3A | 1B 2A | 1A |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | *Liczba błędów ortograficznych* | **0** | **1** | **2** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | **0** | **1** | **2** |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*

# JĘZYK BIAŁORUSKI
## Poziom podstawowy
*Formuła 2023*

JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom podstawowy
Formuła 2023

JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom podstawowy
Formuła 2023